вядаюць жанру хронікі падзей і разам з тым маюць адметныя рысы. У выданнях сканцэнтраваны багаты інфармацыйны матэрыял, выяўлены з разнастайных крыніцаў (ад афіцыйных дакументаў – да мастацкіх твораў). Спалучэнне матэрыялаў розных па аб'ему, стылю, форме, мастацкаеобразныя назвы асноўных раздзелаў – усе гэта забяспечвае навукова-папулярны характар хронік, робіць магчымым выкарыстанне іх шырокім колам чытачоў. Не гледзячы на недасканаласць даведачнага апарату саміх выданняў, яны могуць аказаць вялікую дапамогу бібліятэкарам у выкананні фактаграфічных запытаў. А пры ўмове удасканалення даведачнага апарату і дэідэалагізацыі матэрыялаў інфармацыйныя якасці выданняў значна палепшацца.

## МЕСЦА І РОЛЯ ШКОЛЫ "АНАЛАЎ" У СУСВЕТНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУЦЫ

Н.Р.Кошалева

У апошнія некалькі гадоў навукоўцы рэспублік СНД атрымалі значна большыя магчымасці для знаемства з даследаваннямі розных школ і напрамкаў сусветнай гістарычнай навукі. Асабліва важнымі з'яўляюцца даследаванні школы "Аналаў" альбо пазнейшай "Новай гістарычнай навукі". Як сведчыць амерыканскі гісторык Л.Стоун, гэтая школа, якая сфармавалася паміж дзвумя сусветнымі войнамі, аднавіла гістарычныя веды і зрабіла папярэдняе 40-годзе найбольш прадуктыўным і творчым перыядам сусветнай гістарыяграфіі. Працы яе прадстаўнікоў (Марк Блок, Люсьен Фэвр, Жак Легоф, Імануіл Леруа-Ладзюры, Марк Фэро, Фернан Брадэль і інш.) па сваёму зместу з'яўляюцца найбольш абагульняючымі і сінтэтычнымі сярод гістарычных даследаванняў. Так, напрыклад, у прадмове да сваёй фундаментальнай працы "Цывілізацыя сярэдневяковага Захаду" Жак Легоф адзначаў: "Гэтая кніга адпавядае задачам серыі "Вялікія цывілізацыі" і маей канцэпцыі гісторыі, у прыватнасці гісторыі цывілізацый". Прыхільнікі школы "Аналаў", якія абгрунтавалі канцэпцыю татальнай гісторыі, падкрэсліваюць, што яна пазбягае паняццяў "базіс" і "надстройка", бо яны наследуюць разуменне гістарычных структур і іх узаемадзеяння. Згодна іх перакананняў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тальная гісторыя павінна абапірацца на сацыяльную гісторыю, якая складае сапраўдны змест гістарычнага працэсу.

Гісторыкі школы "Аналаў" і іх паслядоўнікі ў розных краінах свету імкнуцца пераадолець разрыў паміж гісторыяй эканомікі і сацыяльных структур і гісторыяй духоўнага жыцця ва ўсіх яе праявах. Цэнтральная тэма іх прац перайшла з акружаючых чалавека абставін на чалавека ў канкрэтна-гістарычных абставінах.

Надзвычайна цікавай з'яўляецца іх канцэпцыя дзейнасці самаго гісторыка, якая заключаецца ў змяненні яго адносін да аб'екту даследавання. М.Блок і Л.Фэвр процiпаставілі традыцыйную "гісторыю-павестваванне" гісторыі-праблеме". Яны падкрэслівалі, што гісторыкі-пазітывісты, якія прывязаны да гісторыі-павестравання ў асноўным пераказваюць змест гістарычных помнікаў і крыніц і тым самым знаходзяцца ад іх у поўнай залежнасці. Як правіла, у такіх даследаваннях адлюстроўваецца гісторыя падзей і адсутнічае аналіз глыбінных працэсаў і грамадскіх структур.

Гісторыкі-"аналісты" выступаюць супраць пераносу прыродазнаўча-навуковай метадалогіі на гістарычныя даследаванні, прадметам якіх з'яўляецца мыслячы і адчуваючы суб'ект. На сучасным этапе "Новая гістарычная навука" ўяўляе сябе як антрапалагічна арыентаваная гісторыя, у цэнтры ўвагі якой знаходзіцца чалавек.

Гэтая гістарычная школа дала жыццё многім сучасным напрамкам навуковых даследаванняў. Трэба адзначыць, што кіраўнік школы "Аналаў" 50 – пачатку 70-х гадоў Ф.Брадэль некалькі адышоў ад таго напрамку, які зацвердзілі яе заснавальнікі (на увазе маецца чалавечы змест гістарычнага працэсу) і заняўся вывучэннем эканомікі і матэрыяльнай цывілізацыі. Тым не менш яго фундаментальная трохтомная праца "Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка капіталізму. ХУ-ХУШ ст.ст." прызнана вышэйшым дасягненнем французскай школы "Аналаў". Яго паслядоўнік і вучань сацыелаг-афрыканіст І.Валерстайн заснаваў школу мір-сістэмнага аналізу. Работы прадстаўнікоў гэтай школы (Т.Астан, К.Філпін, Ж.Абу-Лугход, Б.Гілз, А.Франк і інш.) з'яўляюцца сення арыгінальным і значным укладам у такі новы і перспектыўны напрамак даследаванняў, як міразнаўства.

Нягледзячы на вядомыя цяжкасці метадалагічнага і інфармацыйнага характару, навуковыя працы школы "Аналаў" не з'явіліся

поўным адкрыццем толькі сення для савецкіх гісторыкаў дзякуючы работам вучняў выдатнага савецкага даследчыка-медзевіста А.І. Неўсыхіна – такіх, як А.Гурэвіч, Л.Мільская, Ю.Бясмертны і інш. А.І.Неўсыхін падтрымліваў у сваіх шматлікіх вучняў вернасць і адданасць навуковай ісціне, якая не залежыць ад кан'юнктурных абставін. Гэта ўсяляе поўны аптымізм. Як адзначае А.Гурэвіч, задачы, якія паставіла "Новая гістарычная навука" патрабуюць сення вучонага новага тыпу, які адначасова валодаў грунтоўнай тэарэтычнай падрыхтоўкай і схільнасцю да пытанняў метадалогіі і эпістымалогіі.

Сення сусветная гістарычная навука перажывае поўныя цяжкасці, якія звязаны з крызіснымі з'явамі сучаснасці, і перш за усе падрывам агульнай веры ў ідэю прагрэса, які надаваў аптымізм навуцы XIX ст. Нападкам і абвінавачванням падвяргаюцца вядучыя гістарычныя школы, у тым ліку і школа "Аналаў". Тым не менш у працах паслядоўнікаў "Новая гістарычнай навукі" галоўным застаецца праблема глабальнай гісторыі і гістарычнага сінтэзу.

## КАМПЛЕКТАВАННЕ І ПРАПАГАНДА БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ У МІНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ЦБС

Т.П.Князява

Глыбокія перамены, праходзячыя у нашым грамадстве, патрабавалі новага падыходу і да работы бібліятэк. У іх праводзіцца цэленапраўленая работа па пераарыентацыі бібліятэчнага абслугоўвання з традыцыйных палітычных і ідэалагічных установак у бок развіцця гуманістычных функцый бібліятэк, станаўленню іх як цэнтраў дасуга, каб памагаць у болей разумным выкарыстанні свабоднага часу, эфектыўным адпачынку людзей, зрабіць бібліятэкі цэнтрамі узраджэння беларускай мовы, беларускай культуры.

Арыентацыя на развіцце гуманістычных, нацыянальных традыцый адбілася на фарміраванні кніжных фондаў Мінскай гарадской ЦБС. Калі на І.01.87 г. колькасць кніг на беларускай мове складала 8704 экз. (альбо 3,5%), кнігавыдача – 14180 (альбо 4,1%), абарачальнасць – 1,6, то на 1.01.91 колькасць экзэмпляраў павысілася да